*Алесь Макарэвіч*
*Магілёў*

# Сацыяльныя прадказанні ці канстатацыя фактаў рэчаіснасці? (Беларуская проза 20–30-х гадоў)

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Беларуская літаратура паслякастрычніцкага перыяду напоўнена такімі мастацкімі фактамі, якія сёння неадназначна ўспрымаюцца прадстаўнікамі розных рэцэпцыйных колаў. Найперш гэта тычыцца твораў пра паслярэвалюцыйныя пераўладкаванні ў грамадстве, а таксама такіх мастацкіх з'яў, як мастацкая дэталь, літаратурны герой, мастацкі кантэкст, асаблівасці сэнсаўтварэння. У сувязі з гэтым у літаратуразнаўчых даследаваннях адносна аднаго і таго ж твора ці перыяду творчасці пісьменніка дастаткова часта з'яўляюцца супярэчлівыя, а то і палярныя каментарыі, ацэнкі, высновы. На такую з'яву аўтар гэтага артыкула ўжо звяртаў увагу ў сувязі з гістарычнай рухомасцю твораў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Гарэцкага і інш. пісьменнікаў[1]. Падобны кантэкст разважанняў, характарыстык і высноў у сувязі з лірыкай Янкі Купалы 1926-га года знойдзем у Вячаслава Рагойшы[2].

---

[1] А. М. Макарэвіч, *"Нясконачаная драма" Ф. Аляхновіча: узвышэнне ці зніжэнне сацыяльнага тыпа і літаратурнага вобраза*, [у:] Куляшоўскія чытанні: Матэрыялы Міжнар. навук. канф. *Творчасць А. Куляшова і адукацыйна-асветніцкія праблемы сучаснасці*, Магілёў 2002, с. 54–57; А. М. Макарэвіч, *Свядомаснае поле літаратурных вобразаў "Раскіданага гнязда" ў кантэксце сэнсавых асаблівасцей спадчыны Янкі Купалы*, "Studia Wschodniosłowiańskie", Białystok 2003, т. 3, с. 7–24; А. М. Макарэвіч, *"Ляўкоўскі цыкл" Янкі Купалы ў кантэксце гістарычнай рухомасці твораў*, "Białorutenistyka Białostocka", Białystok 2010, т. 2, с. 21–35. А. М. Макарэвіч, *Гісторыя беларускай літаратуры першай трэці XX ст. Дапаможнік:* У 2 ч., Магілёў 2013, ч. 1, с. 76–115.

[2] В. П. Рагойша, *На ўздыме: 1926 год у жыцці і творчасці Янкі Купалы*, [у:] *Мова - літаратура - культура:* VII Міжнар. навук. канф., прысвеч. 130-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, Мінск 2012, с. 3–10.

У дадзеным выпадку, не паўтараючы прыведзеныя ў папярэдніх публікацыях тэарэтычныя высновы, звернемся да характарыстыкі мастацкіх з'яў некаторых твораў М. Гарэцкага, М. Зарэцкага, Л. Калюгі, С. Баранавых, А. Мрыя ў кантэксце іх гістарычнай рухомасці. Пры гэтым заўважым, што прыведзеныя ніжэй высновы не прэтэндуюць на абсалютную аб'ектыўнасць (зрэшты, у дачыненні да інтэрпрэтацыі твора мастацтва яе і не можа быць). У той жа час, думаецца, прапанаваныя тут назіранні над мастацкай фактуальнасцю адпаведных твораў дазваляюць вызначыць, як сацыяльныя падзеі, памкненні грамадскіх лідэраў новага часу ў працэсе перанясення іх у мастацкі свет твора ўплываюць на стварэнне ў ім такога кантэксту, які ў адных выпадках мае асуджальны пафас ("Дзве душы" М. Гарэцкага, "Камандзір", "Запіскі Самсона Самасуя" А. Мрыя, "Ні госць ні гаспадар" Л. Калюгі), у другіх двайны сэнс: нібыта ўсхваленне і нібыта асуджэнне, быццам бы прыманне і быццам бы адхіленне фактаў, з'яў, герояў і антыгерояў прататыпнай рэчаіснасці ("Віленскія камунары" М. Гарэцкага, "Сцежкі-дарожкі" М. Зарэцкага, "Межы", "Новая дарога" С. Баранавых).

Звяртаючыся да характарыстыкі асаблівасцей адлюстравання названымі пісьменнікамі паслярэвалюцыйнай супярэчлівай рэчаіснасці, варта ўлічваць наступныя перадумовы яе мастацкага асэнсавання. Па-першае, грамадзянскую пазіцыю пісьменніка, якая, з'яўляючыся вынікам грамадска-палітычных назіранняў у кантэксце яго сацыяльнай дзейнасці, знаходзіла адлюстраванне ў адпаведных творах. Па-другое, узровень (ступень велічыні развіцця: групавы, калектыўны, міжкалектыўны), сілу (ступень праяўлення: нарастаючая, падыходзячая да апагею, абсалютная), маштабы (ступень размаху: лакальны, мясцовы, паўсюдны) сацыяльна-палітычнага ўплыву на свядомасць, грамадзянскую пазіцыю і літаратурную дзейнасць пісьменніка.

Творчасць М. Гарэцкага, у якога да часу стварэння аповесці "Дзве душы" (1919) за плячыма быў значны пісьменніцкі вопыт, трывалыя мастацкія ідэйна-эстэтычныя і псіхалагічныя набыткі, не адчула на сабе выразнага адбітку паслякастрычніцкіх рэвалюцыйных ідэй на ўзроўні іх усхвалення. Пісьменнік на момант стварэння гэтай аповесці не ўдзельнічаў у працы палітычных і дзяржаўных арганізацый новага часу, статус якіх вымагаў бы пазітыўнага адлюстравання ў яго творах ідэй бальшавіцкага кшталту. Грамадзянская пазіцыя М. Гарэцкага як пісьменніка (першая з вызначаных вышэй перадумоў мастацкага асэнсавання супярэчлівых паслярэвалюцыйных падзей) пры гэтым яшчэ не была абумоўлена накіраваным уплывам другой з вызначаных вышэй перадумоў адлюстравання паслякастрыч-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ніцкіх падзей. Адзначанае дае падставы сцвярджаць, што асаблівасці сэнсаўтварэння ў аповесці "Дзве душы" аказаліся больш выразнымі і катэгарычнымі ў параўнанні, напрыклад, з раманам "Віленскія камунары" (1931–1932).

Паміж названымі вышэй аповесцю і раманам у М. Гарэцкага былі *абразкі мінулага жыцця* "Чырвоныя ружы" (1922), у якіх пісьменнік падышоў да тэмы сацыяльнай помсты ў новым – паслярэвалюцыйным – часе. Даўшы ў аповесці "Дзве душы" выразную ацэнку выродлівай сутнасці некаторых праяў бальшавіцкага руху, у "Чырвоных ружах" М. Гарэцкі падводзіць да асэнсавання антычалавечай стыхійнасці гэтага руху. У рамане "Віленскія камунары", паводле вызначэння М. Мушынскага, М. Гарэцкі *застаўся, па сутнасці, на тых жа пазіцыях, што і ў аповесці "Дзве душы" (...) Толькі выказаны погляды – у адрозненне ад аповесці – не так адкрыта, не праз разгорнутыя разважанні герояў, а апасродкавана, логікай сюжэтнага развіцця, праз структуру твора і яго падтэкст*[3].

Аповесць "Дзве душы" не ўпісвалася ў літаратуру новага часу пра класавую барацьбу. Яна "выпірала" з яе, накіроўваючы чытача да нестандартнага асэнсавання падзей паслярэвалюцыйнага часу. Існаванне і ўсведамленне яе праблематыкі было непажаданым для грамадства новага тыпу з ідэалагічнай зададзенасцю функцыянавання сацыяльнай думкі ў ім. А таму гэты твор, як і Купалавых "Тутэйшых", не друкавалі ні асобнымі выданнямі, ні ў зборы твораў у савецкі час. Доўгім аказаўся яго шлях да свайго чытача. Варта звярнуць увагу і на такі факт.

> Па вяртанні ў Савецкую Беларусь з Вільні, М. Гарэцкі, па ўсім відаць, свядома ўстрымліваўся ад таго, каб аповесць стала прадметам шырокага абмеркавання ў друку, не рабіў практычных захадаў ні да яе перапрацоўкі, хоць такія намеры і мелі месца, ні да перавыдання. І гэта зразумела: пісьменнік бачыў, як шырокім фронтам разгортваецца барацьба супраць так званай нацдэмаўскай ідэалогіі і яе носьбітаў (...)[4].

Тым не меней, М. Гарэцкі планаваў істотна дапрацаваць аповесць "Дзве душы". Пра гэта сведчыць запіс у "Плане мае творчасці", датаваны 24 ліпеня 1928 г.[5] Пісьменнік меў намер далучыць да

---

[3] М. Мушынскі, *Падзвіжнік з Малой Багацькаўкі: жыццёвы і творчы шлях Максіма Гарэцкага*, Мінск 2008, с. 418.

[4] Тамсама, с. 189–190.

[5] М. Гарэцкі, *Творы*, Мінск 1990, с. 528. Далей пры спасылцы на гэта выданне ў дужках падаецца старонка.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

твора, напрыклад, такія апавяданні, як "У 1920 годзе", "Апостал", "[Незадача]" (усе 1921), "Усебеларускі з'езд 1917-га года" (1922) і інш. У гэтых творах, пазнейшых па часе стварэння ад аповесці "Дзве душы", скразнымі з'яўляюцца праблемы нацыянальнага руху ва ўмовах бальшавіцкай улады, яго дваістасці і неаднароднасці, праблема шчырасці і прыстасавальніцтва кіраўнікоў з народа ў паслярэвалюцыйным грамадскім жыцці. Падыход аўтара да характарыстыкі і раскрыцця гэтых праблем з апавяданняў у параўнанні з аповесцю не змяніўся. Мастацкія факты названых твораў узмацняюць сэнсавае гучанне некаторых вобразаў і праблем аповесці. У той жа час яны даюць падставы сцвярджаць, што М. Гарэцкі ў "Дзвюх душах" імкнуўся стварыць паказальныя вобразы дзвюх асноўных частак кіраўнікоў з народа ў іх супрацьпастаўленні. Наогул супрацьпастаўленне і супастаўленне – асноўныя і вызначальныя кампазіцыйныя і стылёвыя рысы аповесці.

Вобразу Карпавіча супрацьпастаўлены вобраз Васіля, грамадскім арыентацыям Ігната Абдзіраловіча – перакананні князя Гальшанскага і капітана Гарэшкі. Назіраем таксама супастаўленні паміж характарамі і грамадзянскімі пазіцыямі прадстаўнікоў нацыянальнага руху з адпаведнымі выніковасці іх дзеянняў прозвішчамі: настаўніка Канцавога і *гарэцкага нязграбнага вучня* Сухавея. Урэшце рэшт у апасродкаваным супрацьпастаўленні пададзены вобразы дачкі *міліёншчыка* Алі Макасеевай і земскай настаўніцы Іры Сакавічанкі – паненак, закаханых у Ігната Абдзіраловіча. Падобныя супастаўленні і супрацьпастаўленні прысутнічаюць і ў названых раней апавяданнях: паміж прадстаўнікамі нацыянальнага руху і бальшавіцкай улады.

Вобраз бальшавіка Івана Карпавіча Гаршка прадстаўлены не столькі ў яго развіцці і псіхалагічнай матываванасці яго характару, рэвалюцыйнай дзейнасці, колькі праз абгрунтаваную рэтраспекцыйным планам доказную мастацкую канстатацыю сутнасці гэтага характару. Селянін Гаршчок, не жадаючы працаваць на зямлі, жыць здабыткам, заробленым шчыраю працай, у той жа час імкнецца да сыцейшага лёгкага жыцця. Але і ў манастве, якое дало яму гэтае жаданае трутневае існаванне, Гаршчок бачыць магчымасць яшчэ больш паспяховай рэалізацыі сваіх плоцкіх патрэб. У *сытага і абутага, у гонары і з грашамі* Гаршка праяўляецца горшае ў яго характары: крывадушнасць – рыса, якая раней драмала, не выяўляла сябе напоўніцу. Ён, які падсвядома арыентаваўся на яе рэалізацыю, знаходзіў тыя ўмовы, што дазвалялі яму атрымліваць жаданыя ад гэтага вынікі. Патэнцыйна гэта тып асобы разбуральнага кшталту. Небяспечнасць такога чалавека ў тым, што ён у відавочна неспрыяльных для яго ўмовах імкнец-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ца выдаваць сябе за барацьбіта з несправядлівасцю, аб'ектыўна такім не з'яўляючыся. Архімандрыт, службовую нядобрасумленнасць якога імкнуўся выкрыць гэты манах-прапойца і злодзей, змог, натуральна, абараніць сябе. Несправядлівасць, за спінай якой была духоўная ўлада, перамагла. І тое стала пэўнаю навукаю для Гаршка. Каб быць заўсёды правым (і нават у вінаватасці сваёй (!)), трэба мець дачыненне да ўлады моцных.

М. Гарэцкі звяртае ўвагу на патэнцыйную магчымасць дваення душы гэтага літаратурнага героя. Адзін толькі раз у свядомасці Гаршка ўзнікла сумненне: ці справядлівым будзе яго прыход на братавы харчы перад зімой. Пры гэтым горшы голас душы перамог у свядомасці Гаршка. А лепшы, годны голас, больш ужо не падаваў знака ў душы *змалку на ўсё здатнага і здольнага* селяніна, які свядома выракся сваёй здатнасці.

Патэнцыйную дваістасць характару Карпавіча заўважалі і таварышы па рэвалюцыйнай барацьбе. Сутнасць гэтай з'явы пісьменнік вельмі ёмка вызначыў наступным чынам.

> Але правадыры-інтэлігенты з іх характэрнай інстынктыўнай цямнасцю не мелі да яго асаблівай прыхільнасці. Чулі ў Карпавічу той гатунак людзей-самавукаў, каторыя хоць і вялікай высакосці даходзяць у мастацтве, палітыцы ці абы-якой навуцы, але назаўсёды застаюцца з нейкай хібаю ў самым грунтоўным, а дзеля таго неўспадзеўкі і страшна лёгка зваліваюцца часам на самы дол чалавечай думкі. Яны, гэтакія, нейкім дзівам сумяшчаюць у душы сваёй найлепшы, здаецца, гуманізм і найгоршае, акажацца, чалавекалюбства, хімію і алхімію, марксізм і хірамантыю і з аднолькавай шчырасцю веруюць у тое і другое. Багі іхныя любяць завадзіць сварку, скідаюць адзін аднаго з пасаду і робяць у галаве свайго паклонніка незвычайны сумбур. Багоў гэных зазвычай надта многа, але бываюць часіны, што і няма нічога, вось тады людзі такога гатунку і выробляюць розныя неспадзеўныя штучкі (46).

Адчуўшы ж у бальшавізме *нешта блізкае, роднае і любае*, гэты *дзядок* становіцца з часам рэвалюцыйным лідэрам мясцовага маштабу. *Сячы трэба да карэння* (46), – любіў ён паўтараць свае адносіны да палітычных апанентаў. І калі класавая барацьба давала яму гэтае права, ён з поспехам і задавальненнем (!) яго выкарыстоўваў. Сам жа да непрыстойнасці *піскліявым галаском* рэагаваў-"*вапіў*", "*млеў*" у небяспечных сітуацыях. Парадаксальным і паказальным з'яўляецца тое, што беларус, селянін – Гаршчок – разам з капітанам царскага войска Гарэшкам-Гарэлікам *без міласэрддзя парасстрэлівалі зусім невінаватых людзей, цёмных сялян*, якія змагаліся за свае права на

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

людскае жыццё. Крыху ўзвысіўшыся над уласнай амаральнасцю, Карпавіч пры гэтым рашуча сігае ў злачынную антычалавечую бездань. М. Гарэцкі фактуальна падкрэслівае, што сацыяльны пярэварацень у вобразе бальшавіка Карпавіча – факт не адзінкавы. Паказальным пры гэтым з'яўляецца тое, што пісьменнік не дае супярэчлівым з'явам непасрэдных аўтарскіх ацэнак. Яны прапаноўваюцца як меркаванні працаўнікаў той ці іншай ідэі або з'явы ці факта. Так, напрыклад, ацэнка бальшавіцкіх кіраўнікоў на Беларусі адбываецца пры дапамозе канстатацыі адносін да гэтых кіраўнікоў прыхільніка нацыянальнага руху, настаўніка Міколы Канцавога. *Міколе, як і ўсім адраджэнцам, было дужа цяжка знасіць тое, што на тэрыторыі Беларусі ў бальшавізме, апрача чужынцаў, ачынуліся і ўзяліся кіраваць беларускім сялянствам якраз найгоршыя на іх погляд беларускія людзі* (...)" (69).

Найбольш ёмка характарызуе бальшавіцкі рух на вёсцы Васіль. У дадзеным выпадку адбываецца ацэнка з'явы знутры яе: прыхільнікам рэвалюцыйнага руху.

> (...) Сяло беднае, дык усе маладыя йшлі раней у свет, у гарады, а цяпер павaрочаліся дамоў гультаямі, бандытамі і пад штандарам бальшавізму здзекуюцца над усімі сялянамі. Жывуць паразітамі, паўлезлі ў камітэт беднаты, і ніхто іх не зачапі. Старшыня камбеда – яшчэ даволі малады блазнюк, быў засуджаны ў Маскве за ўбіўства, сёлета ўлетку так пабіў граблямі сваю братоўку, жонку брата-земляроба, што тая памучылась колькі дзён і памёрла, брата ўсадзіў у "чразвычайку", быццам за контррэвалюцыю, а бацьку штодня лупіць чым пападзя, па галаве, ганяець старога на работу, а сам п'янствуе ды гуляець з сваёю бандаю... (87).

Параўнаем гэтыя ацэнкі з вывадамі селяніна Кузьмы – дэлегата Усебеларускага з'езда 1917-га года: – *А як на вас глядзяць бальшавікі вашае воласці? – А хай сабе глядзяць як хочуць, я іх не баюся! Якія там бальшавікі – гора адно. Я добрых бальшавікоў яшчэ не відзеў* ("Усебеларускі з'езд 1917-га года", (130)).

Нават такое кароткае супастаўленне сведчыць, што М. Гарэцкі прадчуваў хуткую прыхільнасць сялянства да *народных*, нацыянальнага руху, бо ў ім вяскоўцы будуць бачыць альтэрнатыву бальшавізму. Тут можна правесці паралель з сучаснай літаратурай: апавяданнем В. Быкава "На чорных лядах". Мяцельскі, адседзеўшы ў *чразвычайцы* за прыхільнае стаўленне да Усебеларускага кангрэса і, адпаведна, за характарыстыку бальшавікоў як *крывавых мяснікоў*, так матывуе сваё рашэнне адмежавацца ад бальшавікоў і іх парадкаў: (...) «*Не! – сказаў ён сабе. – З гэтымі людзьмі не жыць. Не дадуць*». (...) [І калі. – *А.М.*]

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*выбухнула гэта паўстанне за незалежнасць, падаўся ў Слуцак, затым у Семежава, уступіў у Грозаўскі полк*[6].

Сэнсавае гучанне гэтых мастацкіх фактаў і вобразаў у дадзеных творах М. Гарэцкага і В. Быкава падобнае. Творы двух вялікіх мастакоў слова пачатку і канца XX ст., узаемадапаўняючы адзін аднаго, выпраўляюць у некаторых выпадках тэндэнцыйнае і сацыяльна зададзенае асвятленне адпаведных падзей гістарычнай навукай. Літаратурныя творы ў дадзеным выпадку, акрамя сваіх мастацка-эстэтычных функцый, апасродкавана выконваюць функцыю гістарычнай крыніцы аб праўдзе жыцця мінулага.

М. Гарэцкі адным з першых у беларускай літаратуры загаварыў пра відавочнае раздваенне бальшавізму як сацыяльнай з'явы. Пісьменнік паказваў гэты рух у яго неаднароднасці і ў той жа час неперспектыўнасці і трагічнай наканаванасці. Своеасаблівасць такога адлюстравання супярэчнасцей новага часу ў тым, што яны пададзены ў спалучэнні самараскрыцця, апасродкаванай самахарактарыстыкі антыгерояў і прынцыповых ацэнак іх з боку апанентаў. Аўтарскае "я" тут знаходзіцца збоку: непасрэдныя аўтарскія ацэнкі адсутнічаюць. У той жа час рух мастацкай думкі ў творы і яе доказнасць сведчаць пра грамадзянскую пазіцыю пісьменніка. У тых, хто перамог, ён не прымае відавочную антыгуманнасць пэўных іх прадстаўнікоў і формы іх барацьбы. Бязвінная кроў і ахвяры сялянства перакрэсліваюць, робяць для герояў аповесці бессэнсоўнымі самыя прыгожыя ідэі бальшавікоў.

Плануючы дапрацоўку аповесці "Дзве душы", М. Гарэцкі меркаваў, па ўсёй верагоднасці, зрабіць мастацкае ўдакладненне вобразаў бальшавікоў пры дапамозе літаратурных фактаў, якія ўтрымліваюцца ў апавяданнях "Апостал" і "[Незадача]".

У першым з гэтых твораў прадстаўлены вобраз *гарачага камуніста, а даўнейшага прыхільніка беларускага руху таварыша Курапы.* Ён перакананы ў неабходнасці *ўсведамляць вёску.* З гэтым лепшым намерам ён і накіроўваецца туды. Сутнасць гэтага характару аўтар раскрывае двума эскізнымі, але важнымі ў сэнсавых адносінах эпізодамі. Пратэстуючы ў душы супраць буржуазных парадкаў: *спосабу рассаджвання фурмана і падарожнага*, Курапа, здавалася б, нават у дробязях не дапускае арыентацыі на панскасць. Такое анекдатычна вульгарнае разуменне чалавечых узаемаадносін сведчыць пра сляпое следаванне Жабіна банальнаму асэнсаванню формаў пострэвалюцый-

[6] В. Быкаў, *Збор твораў:* У 6 т., Мінск 1994, т. 6, с. 278, 279.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ных узаемаадносін паміж людзьмі: (...) *Ён* [фурман. – *А.М.*], *як быццам якое ніжэйшае стварэнне, сядзіць спераду, а я, камуніст, быццам які пан, сяджу адзаду...* (121).

У той жа час такія разважанні аб раўнапраўі, ранейшыя перакананні ў неабходнасці *ўсведамлення вёскі* разбураюцца, як толькі знікаюць спрыяльныя ўмовы следавання ўсяму гэтаму. Убачыўшы конніка, які паімчаўся да лесу, каб папярэдзіць аднавяскоўцаў, хаваўшых *оней ад "учоту" ў лесе"*, (...) *камуніст інстынктыўна схапіўся за похву рэвальвера.* (...) – *Вязі на дарогу, я ім пакажу! – крыкнуў раззлаваны Жабін* (...) (124).

Рэвалюцыйная гуманнасць, якая разумеецца банальна гэтым камуністам-змагаром, заканчваецца там, дзе пачынаецца права іншага чалавека на жыццё без прымусу. Змагар з прыгняталынікамі сам становіцца паслугачом у новых прыгнятальнікаў: аканомам у новай вопратцы і з новым *бізуном* у руцэ. Не з'яўляецца таму дзіўнай рэакцыя дзеда-селяніна на заўвагу фурмана пра тое, што Курапа гаворыць *папросту: Каб не пазналі, падлу, – злаяўся дзед* (124). І ў гэтай фразе ўтрымліваецца характарыстычная ацэнка адносін селяніна да новага ўладара: прыстасаванец.

Як і ў аповесці "Дзве душы", у апавяданні "Апостал" назіраем дваенне яшчэ аднаго характару: Жабіна. Шчырая вера ў роўнасць, братэрства, справядлівасць, абвешчаныя рэвалюцыяй, перараджаюцца, з аднаго боку, у няроўнасць у праве на выбар асобаю формаў уласнай самаабароны, з другога боку, – у нявер'е ў так прыгожа дэклараваныя правы. Супярэчлівая ўсеагульная з'ява – рэвалюцыя – нараджае дваістыя адносіны да сябе.

Калі *таварыш Курапа* імкнецца прадэманстраваць у бытавых адносінах сваю прымітыўную нязгоду з *панскімі* парадкамі ў адносінах паміж людзьмі, то таварыш з сутнасна для гэтага кантэксту гаворачым прозвішчам – Батрачонкаў – імкнецца падкрэсліць сваю бальшавіцкую панскасць ("[Незадача]"). Начальнік *чразвычайкі*, былы падпасак Арцёмка, жадае паказаць аднавяскоўцам, што ён, прыехаўшы на бацькаўшчыну на службовай машыне, не горшы за былога земскага начальніка Шальновіча – першага, хто праехаў на аўтамабілі ў раёне Батрацкіх Дваркоў.

У фінале аповесці "Дзве душы" трагічнае ўзмацняецца, гучыць поўным голасам, падкрэсліваючы наканаванасць, трэба думаць, не смерці для кожнага чалавека, а наканаванасць для грамадзян новай дзяржавы *хаўтурнага маршу* і *чорнага мурашніка людзей з чырвонымі штандарамі*, якія ідуць пад яго гукі ў пострэвалюцыйнай Беларусі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Працэсія ўжо кранулась ад кватэры нябожчыка [Івана Гаршка. – *А.М.*]. Абдзіраловіч адчыніў вакно і пачуў засмучона-паважныя і прыгожыя гукі хаўтурнага марша.

Чорны мурашнік людзей з чырвонымі штандарамі, з грознымі надпісамі рынуў па вуліцы. Далёка там плыла адчыненая труна з нябожчыкам – на плячах у работнікаў, а следам гутаўся катафалк. Гукі марша ўсё дужэлі і бальней хапалі за душу засмучона-паважным, наканованым (105–106).

Сацыяльны хаос перамагае...

У сувязі з адзначаным вышэй варта прыгадаць наступную выснову А. Рагулі:

У аповесці “Дзве душы” і рамане “Віленскія камунары” пісьменнік папярэджваў аб тым, што змагары за светлую будучыню народа яшчэ толькі выйшлі на “ростані” эпох, што нельга недаацэньваць пагрозы з боку спустошанага чалавека з яго парадаксальнай логікай – рыцара смерці, было б вялікай памылкай лічыць, што народныя масы не могуць трапіць пад яго ўладу[7].

Аповесць “Дзве душы” ўяўляе сабой, акрамя іншага, вынік імкнення пісьменніка ў мастацкай форме асэнсаваць супярэчлівую рэчаіснасць у згодзе і нязгодзе з ёю яе герояў і антыгерояў, якія сацыяльна дзейнічаюць, выступаюць па-рознаму і па розных прычынах “за” і “супраць”. Ды і сама аўтарская пазіцыя ў цэлым уяўляе сабой сведчанне неадназначных адносін пісьменніка як да пэўных грамадскіх з’яў, так і да пэўных характараў у іх.

У параўнанні з усеагульным маўчаннем у згодзе ці нязгодзе, у параўнанні з актыўным грамадскім ухваленнем новай рэчаіснасці аповесць М. Гарэцкага “Дзве душы” была адным з нямногіх прыкладаў грамадзянскага аспрэчвання адназначнасці ў вырашэнні гістарычных пытанняў. Палітычна ж наспявала сацыяльна прадвызначаная неабходнасць адназначнага адлюстравання паслярэвалюцыйнай рэчаіснасці – з аднаго боку, з другога – грамадскага маўчання.

Праблема *наканованага* ў кантэксце паслярэвалюцыйнай рэчаіснасці гучыць не толькі ў “Дзвюх душах”, а і ў “Чырвоных ружах”, у апавяданні “Чалавек у кароне” (1930) М. Гарэцкага.

“Чырвоныя ружы”, як і “Атрута”, “Антон”, адлюстроўваюць вырашальныя моманты ў драме чалавечага духу герояў гэтых твораў і іх жыцця. Кульмінацыя канфлікту і яго развязка знаходзяцца побач, суіснуюць, утвараючы эпіцэнтр трагедыі ў лёсе асобы. Гэтае суіснаванне

[7] А. Рагуля, *Пафас станаўлення: Літ.-крытыч. арт.*, Мінск 1991, с. 95.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

якраз і стварае абразы трагедыі чалавечага духу. Застылыя жалобныя абразы, як шматлікія абразы-іконы, павінны нагадваць рэцыпіенту штодзённа і штохвілінна пра яго мізэрнасць перад трагедыяй жыцця і ў той жа час – пра магчымасць прадухіліць яе. І тут М. Гарэцкі выконваў задачу, якую ставіў перад беларускімі пісьменнікамі: *Шукайце брату свайму дарогу да праўды* (...) ("Наш тэатр", с. 178). Пошук гэты ў пісьменніка пакуль азмрочаны да безвыходнасці; гэта – выразны і характэрны стогн душы М. Гарэцкага дзеля ачышчэння сэрца чытача і гледача.

У "Чырвоных ружах" маральныя праблемы – грэх чалавека і пакаранне за яго – аналітычна прасочваюцца ў гістарычным плане на прыкладзе жыцця чатырох пакаленняў: а) пана і яго прыгонных, б) Нявольскага – аканома і арандатара – і залежных ад яго сялян, в) сына Нявольскага-аканома: садавода *пад адным з большых гарадоў Беларусі*, г) дзяцей Нявольскага-садавода і нашчадкаў былых прыгонных. У гэтым творы выпашэнне знешняга і ўнутранага канфлікту адбываецца на шырокім фоне, мае сацыяльную абумоўленасць і разгортваецца пад уплывам сацыяльных супярэчнасцей эпохі. За хабарніцтва, жорсткасць, крыважэрнасць паноў мінулага даводзіцца ўжо адказваць іх відавочна невінаватым нашчадкам. Эпоха выхавала сына і ўнукаў Нявольскага чулымі людзьмі, якія імкнуцца да прыгажосці і суладдзя ў жыцці. І тая ж самая эпоха нарадзіла ў сялян, якія сталі стыхійнымі бунтарамі-рэвалюцыянерамі, нянавісць да панства, заможнасці, далікатнасці і памяркоўнасці – усяго, што было прыкметай панскага жыцця: *О, кара лёсу! Цяпер пахаванае, глухое смела выйшла з вёскі напаверх...* (...) *Выйшла напаверх і з прагавітасцю шукае спосабу памшчэння. Час расплаты наступіў... Скрозь павіс страшны дух помсты за ўсе нашы вольныя і нявольныя грахі, скрозь шукае ён крывавай стравы*[8], – трагічна канстатуе Нявольскі.

Не цвярозы сэнс кіруе сялянамі, што прыйшлі да садавода Нявольскага па гарэлку, а стыхійны рух. Тут можна правесці параўнанне гэтай стыхійнасці, яе неадназначнасці і складанасці з сабачым, кодлава-стыхійным жаданнем бальшавіцкага блазна, недарэкі-камандзіра, расправіцца з панам і яго дачкой у апавяданні А. Мрыя "Камандзір". Гэта – помста нікчэмнасці за аб'ектыўна неасэнсаваную сваю нікчэмнасць. Стыхійнай неўсвядомленай помстай кіруецца ў сваім грамадзянскім выбары Казак з апавядання В. Быкава "На чорных лядах":

[8] М. Гарэцкі, *Збор твораў:* У 4 тамах, Мінск 1985, т. 2, с. 339.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Галоўным правілам яго* [Казака. – *А.М.*] *у жыцці было: як усе.* (...) *І на паўстанне пайшоў таму, што пайшлі парабкоўцы з маёнтка – усе шасцёра. Калі б яны пайшлі да бальшавікоў, мусі бы, да бальшавікоў пайшоў бы і Казак*[9].

У той жа час душа Мяцельскага з "Чорных лядаў" поўніцца свядомай, асэнсаванай і пераканальнай, помстай-пратэстам[10].

Літаратура, такім чынам, расстаўляе неабходныя аб'ектыўныя акцэнты ў спрэчных пытаннях гісторыі. Дзеля пацвярджэння апошняга вываду варта прыгадаць мастацкія факты з аповесці М. Сяднёва "І той дзень надышоў": вобразы кіраўнікоў калгаснага руху, дзейнасць партызан[11], паставіўшы ўсё гэта ў кантэкст згаданых вышэй твораў М. Гарэцкага, аповесцей В. Быкава "Знак бяды", "У тумане", "Аблава", "Сцюжа", "Пакахай мяне, салдацік" і інш.

Гіне Казя Нявольскі ў "Чырвоных ружах", *бараніўшы Расію ад ворага.* На мяжы страшнага нервовага зрыву псіхіка Марыні і яе бацькі. Страх перад стыхіяй разбурэння ў душы садавода Нявольскага і яго дачкі – таксама *спосаб памшчэння эпохі.* З аднаго боку – стыхія і натоўп. З другога – расчараванне і невыказны страх. Але ж і натоўп выступае за справядлівасць у сваім яе разуменні:

> Мацяйчук. Усё народнае. Бяры, Ванька! Бяры, Санька! Я тутэйшы! Я дазваляю! (...)
>
> Ванька. Напіліся буржуі нашай кровушкі! Праклятыя!
>
> Санька. Мы ў акопах без хлеба дохнем, вошы кормім, а яны тут... А, буржуі! Дабраліся да вас!...[12]

Кожны з бакоў ведае *сваю* праўду. І гэтая двухбаковая праўда ёсць стыхійнай расплатай і заканамерна абсурдным пакараннем для сям'і Нявольскіх за грахі яе бацькі і дзеда, па віне якога паміралі на будаўніцтве чыгункі няшчасныя ў сваёй даверлівасці сацыяльныя немаўляты – сяляне. І зноў жа, як і ў "Атруце", "Антоне", вінаватымі становяцца відавочна нявінныя; знак пакарання кладзецца на нягрэшных. У маналогу садавода Нявольскага ("Навошта кроў?") утрымліваецца падагульненне наступнай праблемы: наканаванае ахвярапрынашэнне дзеля пакарання праз папярэджанне. *Нявольскі.* (...) *Тады я*

---

[9] В. Быкаў, *Збор твораў:* У 6 т., Мінск 1994, т. 6, с. 284.

[10] Тамсама, с. 278–279.

[11] М. Седнев, *И тот день пришел,* [в] «Неман» 1991, № 11, с. 47, 54, 59, 63, 74, 79.

[12] М. Гарэцкі, *Збор твораў:* У 4 т., Мінск 1985, т. 2, с. 341.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*ліў кроў на грунт* [пад ружы, каб яны станавіліся пышнымі і сакавітымі. – *А.М.*], *не думаючы аб зарэзанай жывёле, з якой яна выцекла. А цяпер, цяпер я – тая нешчаслівая, невядомая рэвалюцыі жывёла. Я ўжо стары, я ўжо магу пайсці дабром на грунт, але і мой дух здрыгаецца ад жудасці, не хоча смерці. А яны ж, дзеткі мае мілыя, яны ні ў чым не вінаваты*[13].

Праблема крыві ахвяр паслякастрычніцкага часу як выніку сацыяльнай барацьбы і пакарання ў метафарычным кантэксце ставіцца ў апавяданні М. Гарэцкага “Чалавек у кароне”:

> Калі ўжо выхадзіць з-пад павеці, з гэтага гумна, – даганяе мяне гэты здаравенны, у чырвоных штанах, і на галаве ў яго – вялікая, медзяная, але гладкая карона з крыжыкам, і ў руках стрэльба, і дзірачка рулі глядзіць проста мне ў грудзі...
>
> Канец мне, бо ён не хоча, каб я вынес адгэтуль яго тайну.
>
> Я хачу прасіць, умаўляць не забіваць мяне, хоць і амаль што няма надзеі на ратунак: гэтыя людзі жорсткі і разумна-бязлітасны[14].

М. Мушынскі вызначае гэтую частку апавядання як *трапную ацэнку грамадска-псіхалагічнай атмасферы пачатку 30-х гадоў*[15]. І працягвае: *“Чалавек у кароне”, ваяўнічы ўладальнік “чырвоных штаноў” і стрэльбы, – гэта сімвал жорсткай, бязлітаснай улады, гатовай расквітацца з кожным, хто паспрабуе раскрыць яе таямніцы*[16].

Грунтоўную ацэнку рамана “Віленскія камунары” М. Гарэцкага прапанаваў М. Мушынскі ў кантэксце параўнальных літаратуразнаўчых даследаванняў Д. Бугаёва, А. Адамовіча, І. Чыгрына. Заслугоўваюць увагі высновы даследчыка пра асаблівасці выбару галоўнага героя і формы аповеду, што *прадыктаваны імкненнем аўтара замаскіраваць ад пільнага цэнзарскага вока свой уласны пункт гледжання, у тым ліку і ўласнае разуменне рэвалюцыі, схавацца за героя-апавядальніка*[17]. Сярод доказаў, якія пацвярджаюць такую выснову, цікавымі з'яўляюцца наступныя: непрыманне Мацеем Мышкам бацькавага запрашэння пераехаць з акупаванай палякамі Вільні ў савецкі Мінск, а таксама мастацкі падтэкст твора[18]. У прыватнасці: (...) *аўтар “Віленскіх камунараў” не лічыў, што Кастрычнік завяршыўся перамогай*

[13] Тамсама, с. 338.
[14] М. Гарэцкі, *Збор твораў:* У 4 т., Мінск 1984, т. 1, с. 397.
[15] М. Мушынскі, *Падзвіжнік з Малой Багацькаўкі...*, с. 412.
[16] Тамсама, с. 412.
[17] Тамсама, с. 425.
[18] Тамсама, с. 455–456.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*і што рэвалюцыя быццам бы сцвердзіла ідэю народаўладдзя і прынесла сацыяльную свабоду і нацыянальную незалежнасць народам былой царскай імперыі*[19].

Якую ж ідэю сцвярджалі змагары за ідэалы рэвалюцыі і што яна несла ў творах іншых пісьменнікаў першай трэці XX ст.? У сувязі з гэтым звернемся да мастацкіх фактаў з твораў пісьменнікаў, якія пазней за М. Гарэцкага прыйшлі ў літаратуру, у той ці іншай меры займалі актыўную грамадзянскую пазіцыю ў адносінах да пераўладкавання рэчаіснасці ў адпаведнасці з сацыяльна-палітычнымі ідэямі новага часу, – рамана М. Зарэцкага "Сцежкі-дарожкі" (першае асобнае выданне – 1928), аповесці Л. Калюгі "Ні госць, ні гаспадар" (апублікавана ў 1928), аповесцей С. Баранавых "Межы" (1929), "Новая дарога" (1931–32), рамана А. Мрыя "Запіскі Самсона Самасуя".

Грунтоўную ацэнку рамана М. Зарэцкага "Сцежкі-дарожкі" ў кантэксце праблемы гістарычнай рухомасці твора даў М. Мушынскі[20]. Ён, у прыватнасці, доказна характарызуе высновы А. Адамовіча, В. Каваленкі, І. Чыгрына А. Майсеенкі, Д. Бугаёва і іншых даследчыкаў у адносінах да герояў і праблематыкі гэтага рамана, адзначаючы, што *многія калізіі твора ўвогуле застаюцца непрачытанымі альбо ацэненымі павярхоўна, спрошчана*[21]. У сувязі з гэтым М. Мушынскі актуалізуе характарыстыку вобразаў Нікадзіма Славіна, Матруніна, Халімы, Андрэя, паненкі Раісы і іншых герояў твора. Пры гэтым звяртаецца ўвага на тое, што *пісьменнік ішоў ад непасрэдных уражанняў, ад асабістага і перажытага* і што *трэба абавязкова прымаць пад увагу час напісання твора, здольнасць пісьменніка прадбачыць будучыню*[22].

Якімі ж былі гэтыя *непасрэдныя ўражанні* і *прадбачанні будучыні* М. Зарэцкім у "Сцежках-дарожках"? Як выглядае ў гэтым творы мастацкая і грамадзянская пазіцыя пісьменніка ў адносінах да некаторых герояў і антыгерояў паслярэвалюцыйнай рэчаіснасці?

Галоўны герой рамана – Васіль Лясніцкі – вельмі доўгі час знаходзіцца ў стане раздваення яго меркаванняў, памкненняў, урэшце – раздваення душы (прыгадаем у сувязі з гэтым псіхалагічны аспект

[19] Тамсама, с. 456.

[20] М. Мушынскі, *Праўдзівая гісторыя жыцця і творчасці Міхася Зарэцкага*, Мінск 2005, с. 63–100.

[21] Тамсама, с. 69.

[22] Тамсама, с. 70, 77.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

"Дзвюх душ" М. Гарэцкага). Для гэтага вобраза ўласцівыя зменлівасць настрою, сімпатый і антыпатый да аднаго і таго ж чалавека (Ніны, Андрэя, паненкі Раісы, Халімы і інш.). Урэшце нічога дзіўнага ў гэтым няма: назапашванне сацыяльнага і асобаснага вопыту заўсёды спрыяе такім зменам. Лясніцкі даволі хутка захапляецца новымі ідэямі, аддаецца ім. Пры гэтым ён схільны да дэструкцыйнасці, помсты і ў той жа час не прымае такія з'явы. Прыгадаем у сувязі з гэтым наступныя факты: жаданне Лясніцкага помсціць яўрэям (пры гэтым у свядомасці героя не ўзнікае пытанне "за што?" – і гэта таксама паказчык часу грамадзянскай барацьбы), Раісе Янавай, а таксама яго пратэст супраць падбухторвання Андрэем сялян на гвалтоўны падзел панскай маёмасці і помсты сям'і Раісы Янавай. Распальванне ў сабе варожай нянавісці:

Лясніцкі (...) Адчуваў сябе поўным героем. (...) Ён прымае ўдзел у цэлай змове, будзе кіраваць палітычным выступленнем, яго могуць забіць, і ён можа забіць каго-небудзь...

О, ён заб'е... Толькі дайце яму дабрацца да якога пархатага... У, як ён іх ненавідзіць!..

І, каб сапраўды распаліць у сабе нянавісць, Лясніцкі стараўся ўявіць самага злоснага, самага атрутнага яўрэя – крывога Пейсіка, у якога ён купляе табаку. Пейсіка ўявіць яму ўдалося лёгка, але нянавісці чамусьці не было да яго аніякай. Гэта яго *нервавала, і ён пачынаў злавацца. Тады гэту* беспрадметную злосць ён накіраваў на Пейсіка і лічыў, што ўсёт-кі і ён, не менш за іншых, ненавідзеў яўрэяў (...).

І ўсцяж цэлую ноч Лясніцкі ўяўляў сабе беднага Пейсіка, правяраючы на ім сваю нянавісць, падбіраючы ў думках яму самую страшэнную крывавую расправу[23].

Шалёная гарэзлівасць-помста Раісе Янавай:

Ён быў рад, што так абышоўся з паненкай, ён быў зусім задаволены сабой. Хацелася толькі яшчэ падвесці нейкі сталы грунт пад гэту мімавольную сварку, знайсці ёй нейкае апраўданне. Гэта было нятрудна зрабіць. У яго бышці было два выпадкі, калі ён быў пакрыўджаны ў яе прысутнасці і нават пры яе ўдзеле. І вось ён цяпер памсціўся. Яна, вядома, не помніць тых выпадкаў. Яна зусім і не знае яго (123).

Намеры Лясніцкага не дапусціць сялян да непарадкаў:

[23] М. Зарэцкі, *Збор твораў:* У 4 т., Мінск 1990, т. 2, с. 73, 74. Далей пры спасылцы на гэта выданне ў дужках падаецца старонка. Там, дзе адпаведныя факты твора толькі згадваюцца, для пацвярджэння прыводзяцца таксама адсылкі на гэта выданне ў дужках.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А.Кулешова

Лясніцкі з трывогай зірнуў на Андрэя.

– Слухай, Андрэй. Я буду ўсё рабіць, каб не даць сялянам дайсці да якога-небудзь непарадку. Я спадзяюся, што і ты мне паможаш.

Андрэй засмяяўся:

– Ха-ха-ха!.. Чым горш – тым лепш!.. (154)

Ён [Лясніцкі. – *А.М.*] павінен быў нешта зрабіць, гэта быў яго грамадзянскі абавязак. (...)

– А во што гэта... Сягоння мы забяром у пана луку, а заўтра мы ўбачым, што ў Нялляна ёсць добры кавалак пахаты, – забяром гэты кавалак, а тады ўбачым, што ў Ляксандры карова лішняя, – тож забяром, а тады пойдзем па засеках мацаць... Га? Вы пра гэта падумалі?

Гэтыя апошнія словы [Лясніцкага. – *А.М.*] зрабілі нечаканы ўплыў. У гомане, які за ім узняўся, не чуваць было ўжо дружнага аднадумства – пайшло па натоўпе блытанае замяшанне (157).

Лясніцкі выступае супраць разбуральнасці, абыякавасці сялян да панскага гора на пажары, выяўляючы *пачуццё жывога чалавечага пратэсту супроць дзікай стыхіі, супроць звярынае жорсткасці* (194–196). У гутарцы з Андрэем, калі той вяртаўся ў горад пасля наведвання вёскі (агітаваў за класавую помсту), Васіль пратэстуе супраць такой помсты, якая *разбудзіць дзікія інстынкты.* Пры гэтым ён бачыць наступнае выйсце: *трэба неяк стрымліваць* [сацыяльную разбуральнасць. – *А.М.*], *шукаць іншых спосабаў, іншага шляху...* (201). У той жа час галоўны герой рамана “Сцежкі-дарожкі” эмацыйна далучаецца да рэвалюцыйнай істэрыі народа; ён, як і гэты народ, прагне расправы з генералам Духонiным: Лясніцкі *разам з усімі быў памкнуўся наперад, гатовы ўпіцца ў бяссільнае акрываўленае цела* (248–249). Звернем увагу на той факт, што ў гэтай частцы рамана пытанне пра ахвяры рэвалюцыйнага змагання гучыць як трагічнае прадказанне: *Ідучы ад крывавага месца, ён* [Лясніцкі. – *А.М.*] *не мог зірнуць у твар сустрэчным – яму здавалася, што яшчэ не сцёрлася тая грымаса, што яшчэ чакаюць нечага, што жорстка стаіць ва ўсіх маўклівае запытанне: – Хто наступны?* (248–249).

Гэтае пытанне ў кантэксце грамадзянскіх выбараў Лясніцкага можа мець свой працяг, удакладненне. *Хто наступны* сярод відавочных ворагаў рэвалюцыі? Пацвярджэннем гэтаму могуць быць наступныя факты: прыліў *агнёвай нянавісці*, калі Васіль расказваў Андрэю аб *чорных звярынствах* польскіх легіянераў (309), канчатковае перакананне Лясніцкага ў тым, што трэба ісці са сваімі *дамагацца волі і шчасця* (311). У той жа час такое пытанне можна спраецыраваць і на перыяд змагання з ворагамі савецкай улады ў канцы 1920–1930-х гадоў. У такім выпадку ў кантэксце згаданых вышэй і ніжэй фактаў (адносі-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ны Лясніцкага да разбуральнай дзейнасці Андрэя, сутнасць гэтай дзейнасці) можам прыйсці да высновы пра прыкметы сацыяльнага прадбачання М. Зарэцкага-пісьменніка: прадказанне сацыяльнай трагедыі паслярэвалюцыйнага часу.

Пацвярджэннем прыведзенай вышэй выснове, акрамя іншага, могуць быць наступныя факты. Лясніцкі *адчуваў рост наўкола чорнай трывогі*, паветра грамадзянскага змагання прадказвала яму, *што нешта ідзе, набліжаецца, што гатоў зашумець бурлівы, можа, крывавы баль* (185). Галоўны герой рамана прадчувае набліжэнне *непрагляднай сцяны* цёмнага і жудаснага, перад якім у яго нараджаецца страх (ліст да Нікадзіма Славіна пасля развітання Васіля з Андрэем, Макрынай і паненкай Раісай на станцыі (205)), жаданне *уцячы ад самога сябе* (252). У працэсе свайго грамадзянскага выспявання Лясніцкі прыходзіць да апраўдання класавай барацьбы; у той жа час ён разумее і ў некаторай ступені апраўдвае перакананасць кожнага з бакоў, якія ваююць, у правільнасці, справядлівасці іх барацьбы:

> Ты бачыш, што робіцца ў жыцці? А ці бачыў ты [Халіма – *А.М.*], як сяляне палілі маёнткі, як выходзілі яны з віламі, з тапарамі і гналі к чортавай матары сваіх спрадвечных ворагаў – памешчыкаў? Ці бачыў ты, як гэтыя памешчыкі, вярнуўшыся за штыкамі польскіх жандараў і з іх дапамогай палілі і руйнавалі гэтыя вёскі, сотнямі секлі сялян, забівалі, мучылі... ты гэта бачыў? А ці бачыў ты, як стыхійна збіралася ў партызанскія атрады сялянская моладзь, каб даць адпор ашалеламу панству? Што гэта? Бунт? Хто бунтаваў тут – сяляне ці памешчыкі, га?.. Хто шукаў жыцця, а хто баяўся яго?.. Ці заўважыў ты, што ў гэтым "бунце" былі два рэзка акрэсленыя станы і што абодва біліся за жыццё – жорстка біліся, да самазабыцця, да самаахвярнасці... (374–375)

Праблема бунту, яго сутнасці і выніковасці – адна з галоўных у рамане "Сцежкі-дарожкі". Пацвярджэннем таму могуць быць перакананні, довады і ўчынкі Халімы. Маючы, паводле вызначэння Андрэя, *у крыві нейкія дрожджы паганыя* (219), гэты літаратурны герой *не адчуваў пэўнае сімпатыі ні да старога ладу, ні да рэвалюцыі* (62); *крышыць, ламаць* (97), бунтаваць, *ваяваць, буяніць, калаціць "задрыпаны свет"* (276) – вось галоўнае жыццёвае крэда Халімы. Тым не меней, у вусны гэтага антыгероя М. Зарэцкі ўкладвае такія канстатацыі, якія ўскосна аспрэчваюць бальшавіцкую дыктатуру ў адносінах да права асобнага чалавека на волю.

> – Я баюся, ды не так. У мяне страх перад смерцю, а ў вас перад жыццём. Вы жыцця поўнага баіцёся. Вам трэба цацачкі, а не жыццё (276).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

> – Я асоба! Я – чалавек! Разумееш? Які вам клопат да мяне! Хто даў вам права ўціскаць мяне ў цесны мундзір, калі я ў сарочцы хачу... голы хачу хадзіць... га?.. Хто даў вам права лезці ў жыццё маё, дыктаваць законы і правілы?.. У мяне ёсць закон – мая воля... Я вольным хачу быць. Я – чалавек і хачу быць чалавекам... Што вам трэба, чаго вы лезеце?..” (374)

Менавіта такім тыпам чалавека, якому трэба пераўладкаваць свет (*дыктаваць законы і правілы*) у адпаведнасці з яго – правільнымі – перакананнямі, з’яўляецца Андрэй – адзін з кіраўнікоў паслярэвалюцыйнага грамадзянскага змагання.

Характарыстыкі гэтага літаратурнага героя насцярожваюць ужо ў самым пачатку твора: *Ніхто ніколі не бачыў, каб ён хоць трошкі ўзрушыўся. Ніхто ніколі не бачыў, каб змяніўся яго твар, заўсёды аднакава цёплы і ветлы, заўсёды нейкай мяккай сілы* (63).

Такія характарыстыкі выклікаюць сумненні ў шчырасці і пастаянстве *цеплыні, ветлівасці і мяккасці* Андрэевага твару, адсутнасці ўзрушэння на ім. Кантэкст жа дадзенай характарыстыкі (трэба заўважыць – характарыстыкі хутчэй Васілёвай, а не аб’ектыўнай аўтарскай) у праекцыі яго на далейшыя ўчынкі і ўвогуле грамадзянскую пазіцыю Андрэя падкрэслівае, што бурлівая дзейнасць гэтага літаратурнага героя, абсалютная яго перакананасць у правільнасці ўласных грамадскіх і жыццёвых выбараў – гэта не што іншае, як чарговая гульня ў карты. Згадаем папярэдні кантэкст прыведзенай вышэй знешняй характарыстыкі Андрэя: *прыгожа гуляе Андрэй* у карты.

Мінае некалькі эпізодаў рамана – і характарыстыкі знешнасці Андрэя ўжо змяняюцца: (...) *Трудна яго зразумець. Неяк заўсёды хавае ён шчырасць сваю за гэтым мяккім выразам буйнога твару, за хітраватай усмешкай* (63).

Гэты *малапісьменны* грамадскі актывіст *ведае ўсё і, самае галоўнае, мае нешта сваё, сваю пэўную думку, свой інтарэс* (69). Такія характарыстыкі героя ў пачатку твора таксама насцярожваюць, выклікаюць антыпатыю ў адносінах да яго. Аднак жа антыпатыя, як і сімпатыя, – гэта з’явы ў некаторай ступені суб’ектыўныя. Прасочым, разбурваецца ці захоўваецца такая суб’ектыўнасць у кантэксце іншых эпізодаў твора.

*Дужая фігура Андрэя, яго буйны, выразна і разам з тым мякка акрэслены твар* (152), схільнасць да дэмагогіі (162) спрыяюць дасягненню грамадскіх памкненняў гэтага літаратурнага героя: ён *умее весці за сабой людзей, умее граць на самых тонкіх струнах іх псіхікі. Ён нейкі д’ябал, чорны геній руйнавання* (162).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

> Страшны ён чалавек, гэты Андрэй. І няўжо гэта ўсе такія бальшавікі? Чаго яны хочуць, чаго дамагаюцца?
>
> (...) Андрэй чаруе сваёй прастатой, прастатой праграмы свае, сваіх дамаганняў. А Лясніцкі таму і баіцца ўсяго гэтага, што яно занадта проста – да дзікасці проста, да недарэчнасці. Лясніцкаму прастата гэта здаецца дэмагогіяй, ён ёй не верыць, ён чуе тут нейкі ліхамысны падкоп (162).

*Ліхамысны падкоп* гэтага *малапісьменнага* і пры тым самаўпэўненага бальшавіцкага актывіста – гэта паказальны факт паслякастрычніцкага часу. Сімвалічнай з'явай бачыцца пажар у панскім маёнтку, на які падбіў сялян Андрэй. Прычым заўважым наступнае: Андрэй у гэтай мясцовасці чужы (нібыта за харчамі прыехаў у Васілёву вёску); ён ведае пра адносіны сялян з панам і ацэньвае іх толькі з пазіцыі класавай барацьбы; іншыя аспекты такіх адносін яго не цікавяць, над імі ён нават не задумваецца. Андрэй у час і пасля пажару, які ўчынілі сяляне ў панскім маёнтку ў выніку іх падбухторвання гэтым агітатарам, ва ўспрыманні Васіля паўстае як страшны злачынца з *пустой халоднай усмешкай: – Ты... гэта звярынства... гэта дзікая крыважэрнасць... ты – разбойнік...*

*Андрэй спакойна глядзеў на яго* [Васіля. – *А.М.*], *не крануўся нават, толькі ўсмешка стала пустой, халоднай* (197).

У гэтай, як і іншых сітуацыях, Васіль выступае як носьбіт аўтарскай ідэі грамадскай цвярозасці і разважлівасці пры вырашэнні класавых супярэчнасцей і здзяйсненні класавай барацьбы. У той жа час М. Зарэцкі пераадрасоўвае свайму літаратурнаму герою – Васілю Лясніцкаму – непасрэдныя ацэнкі некаторых прадстаўнікоў бальшавіцкага асяроддзя (да яго належыць і Андрэй) як той часткі грамадства, якая вядзе яго да сацыяльнай варожасці, разбурэння гуманных адносін паміж яго прадстаўнікамі. Тут назіраем наступную літаратурна-мастацкую з'яву: вонкавае дыстанцыраванне аўтара ад свайго героя: маўляў, не я, а герой блукае па сцежках-дарожках супярэчлівага часу і робіць пры гэтым такія катэгарычныя высновы ў адносінах да асобнага актывіста грамадскага змагання.

У той жа час М. Зарэцкі характарызуе дэструкцыйнасць грамадскага змагання ў паслярэвалюцыйны час пры дапамозе непасрэдных выказванняў бальшавіка Андрэя, гэтым самым узмацняючы прадказальны пафас свайго твора. Андрэй рашучы і перакананы ў справядлівасці анархічнай і рэвалюцыйнай помсты. Ён упэўнены, што барацьбу можна весці толькі з дапамогай разбурэнняў і руйнавання, фанатычна верыць у гэта і пераконвае ў сваёй веры астатніх. Пра гэта асабліва яскрава сведчыць яго выказванне ў час вяртання ў горад пасля пажару

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ў панскім маёнтку і рабавання панскіх свірнаў у Васілёвай мясцовасці.

> А сапраўдны агонь яшчэ будзе, ён выбухне разам, і гэтыя іскрачкі растануць у ім, увальюцца ў яго. Ён ідзе, гэты агонь, набліжаецца. Гэты агонь будзе страшны – у ім будуць і стогны, і кроў, у ім будзе чорная смерць, у ім будзе вялікае руйнаванне. Ён таму і будзе жыватворчы, гэты агонь, што скалане ўсё магутным ударам свайго знішчажэння, разбудзіць свежыя сокі зямлі, дасць балючы, але патрэбны штуршок застыгламу ў аледзянелых формах жыццю... Пажар набліжаецца... (...) Пажар будзе не такі, які ты [Васіль – А.М.] бачыў сёння, гэта толькі прэлюдыя, толькі падрыхтоўка... Ужо відаць зарыва, ружавее на ўкрытым чорнымі хмарамі небе. (...)
>
> Ён фанатычна верыў ў тое, што гаварыў (202).

Небяспечнасць такога тыпу змагароў у тым, што яны здольныя запаліць уласным фанатызмам іншых і павесці на здзяйсненне разбурэнняў і руйнавання пры дапамозе *страшнага агню*. Прыгадаем у сувязі з адзначаным наступную характарыстыку гэтага рабочага-бальшавіка, які прыехаў у незнаёмую для яго мясцовасць, каб наладзіць там змаганне за сацыяльную справядлівасць: *Добра ўмеў гаварыць Андрэй, знаў, як дадзець да нутра. І напаследак ён так заўладаў усіхнім настроем, што, здаецца, каб узняў ён голас ды крыкнуў – гайда на пана! – дык бы і рынуліся ўсе як адзін. Як кончыў ён гаварыць, зноў у грамадзе была дружная згода, зноў была адна воля, адно імкненне* (159).

Грамада, якая схільная пайсці за андрэямі-бальшавікамі, у пераважнай большасці не разумее, што рэвалюцыйная напорыстасць падобных кіраўнікоў можа быць скіравана супраць гэтай самай грамады. Толькі ўжо ў іншы час і пры адпаведных умовах... Калі Андрэй агітаваў сялян на барацьбу супраць пана, толькі адзін з прысутных (*чырвоны ўвесь, з сцюдзёнымі вачмі* (158)) выказаў меркаванне пра тое, што і супраць *сваіх* некалі можа быць скіраваны рэвалюцыйны перадзел, барацьба за сацыяльную справядлівасць: – *Ага... Значыць – бяры, хапай, дзе толькі можна... Значыць – і ў сваіх тож можна... Іш ты які...*

*Андрэй зусім спакойна адказаў: – Калі ў сваіх задужа* [зямлі. – *А.М.*], *дык чаму ж не, можна і сваіх абрэзаць...* (158).

І ў гэтым выказванні чужынца-бальшавіка, калі ўлічыць яго рэвалюцыйную апантанасць, гучыць сацыяльнае прадказанне: *абразанне* абавязкова адбудзецца. Толькі яно, гэтае *абразанне*, будзе больш балючым, бо накіравана будзе супраць *сваіх*. Гісторыя пацвердзіла такое прадказанне, зрабіўшы трагічнае ўдакладненне: абразанне думкі, жыццёвага выбару, зямлі, волі, жыцця. Пацвярджэнне гэтаму знаходзім у аповесці С. Баранавых "Новая дарога" (пра гэта – ніжэй).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У апошняй частцы рамана "Сцежкі-дарожкі" перакананасць Андрэя ў тым, што барацьба павінна быць крывавай, гучыць, адначасова і як канстатацыя пашыранай у грамадстве ідэалагічнай высновы-аксіёмы і як кантэкстуальнае прызнанне таго, што іншага шляху быць не можа: *Андрэй ледзь-ледзь усміхнуўся (...): – (...) Агонь і кроў – гэта сімвал нашага часу. (...) А цяпер усё загарэлася. І кроў палілася – многа будзе крыві, яшчэ будзе ліцца, можа, доўга яшчэ... Што ж, братка, трэба змагацца, здабываць жыццё – хто ж захоча без бою загінуць!* (308)

*Цёплая даверлівасць*, якая з'явілася ў Андрэя да Лясніцкага пасля такога выказвання яго сябра па рэвалюцыйнай барацьбе, падмацавана далей сцверджаннем пра тое, што Лясніцкі таксама *не хаваў гэтай нянавісці, не саромеўся жорсткай зголенасці сваіх пачуццяў* (309), калі апавядаў пра *крывавыя чорныя звярынствы* (309) ворагаў. Магчыма, такім кантэкстам М. Зарэцкі, адчуваючы крывавы подых гэтай барацьбы і ў адносінах да яго, імкнуўся сцвердзіць, што ён свой, што ён з тымі, хто кіруе змаганнем за светлае будучае жыццё.

Адзначанае вышэй раздваенне асобы галоўнага героя рамана "Сцежкі-дарожкі" з'яўляецца паказчыкам і вынікам такога працэсу, як уплыў дэструкцыйнай рэчаіснасці і яе падзей на свядомасць і жыццёвыя пазіцыі, учынкі герояў і антыгерояў гэтай рэчаіснасці. Гэтыя пазіцыі і ўчынкі ўспрымаюцца вачыма і ацэньваюцца свядомасцю найперш Лясніцкага. У той жа час, уводзячы ў раман маналогі іншых герояў (Матруніна, Андрэя, Халімы) па праблемах класавай барацьбы, адпаведныя ўчынкі герояў, М. Зарэцкі стварае такі мастацкі свет, у якім прадстаўлена палярнасць грамадзянскіх пазіцый і жыццёвых выбараў. І ў гэтым таксама назіраем своеасаблівае дыстанцыраванне пісьменніка ад выразнай аўтарскай палітычнай пазіцыі. Пры гэтым, думаецца, права вызначэння эстэтычна каштоўнага і антыкаштоўнага ў кантэксце мастацкага свету твора М. Зарэцкі перадае рэцыпіентам яго твора.

Праблема змагання і змагароў за новае жыццё ў мясцовым (лакальным) маштабе адлюстравана ў аповесці Л. Калюгі "Ні госць ні гаспадар". Аўтар гэтага твора на першы план грамадскага жыцця ў вёсках Зыждрыца, Хатніца выводзіць маладых людзей, якія праводзяць арганізацыйную работу па наладжванні дзейнасці камсамольскай ячэйкі. Пераважная большасць актывістаў гэтага твора – гэта свае, мясцовыя хлопцы, якія па розных прычынах далучаюцца і ўдзельнічаюць у грамадскім руху.

Сярод такіх герояў новага часу – Бладзік Мотуз – *адзін камсамо-*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*лец на ўсю Жыздрыцу*[24]. Набраўшыся палітграматы на двухтыднёвых *курсах камсамольскага актыву*, Мотуз натхніўся на стварэнне мясцовай камсамольскай ячэйкі. Пры гэтым аўтар звяртае ўвагу не на стваральнае ў грамадскіх арыентацыях мясцовага актывіста (іх фактычна няма), а на разбуральныя, на праяўленне ў яго актывісцкіх памкненнях дыктатарскіх рысаў: наладзіць усё па-свойму (*свайго я на вецер не пускаю* (62)), а з нязгоднымі расправіцца *пад мятлу: І жыў не буду, калі сваю ячэйку не налюдзяю. А хто мала-веля што закуражыўся, дык, браце, у парадку камсамольскай дысцыпліны – айрус вон! Яны, я ведаю, каюцца, што тады на курсы выправілі, але цяпер – позна, я ўжо парадкі ўвазнаў. Палавіну ячэйкі трэ будзе пад мятлу (...) А хто спрацівіцца, і таго вон, каб і шныру не было. Я, брат, калі чаго наважу, дык здохні, а дайду, і па-моймy выйдзе* (62).

Тут варта заўважыць, што Л. Калюга гэтыя Бладзікавы заліхвацкія самахарактарыстыкі суправаджае такімі эпізодамі рэальных яго дзеянняў, якія характарызуюць гэтага мясцовага актывіста як чалавека своекарыслівага, няшчырага, двурушнага, для якога кар'ера *нізавога таварыша* – гэта найперш магчымасць самасцвердзіцца (прыгадаем: *з сельсавету сцібіў* "Беларускую вёску" на цыгаркі (57); *каецца*, што *цалюткі вечар у Хатніках праседзеў на нейкім камсамольскім сходзе* і з-за гэтага ў сваёй вёсцы *гульню прапусціў* (59), крадзе ў школе, вартавацъ якую настаўнік даверыў актывістам, *самую грубейшую кніжку* ("Гісторыя грамадзянскай вайны ў Францыі" Карла Маркса) для грамадскай *чытальні*; пры гэтым апраўдвае сябе наступным чынам: *Хай будзе. А тамака б усё роўна нехта спёр* (65, 72); праяўляе панскасць у адносінах да маці: не так, не своечасова падала вячэру, а сам пры гэтым мае нядбайныя адносіны да бацькавай гаспадаркі (89–90)). Паказальным мастацкім фактам з'яўляецца тое, што мясцовы актывіст Бладзік Мотуз цураецца таго, на чым трымаецца вясковае жыццё, – працы на гаспадарцы. Пра гэта выразна сведчыць заўвага Мотуза-бацькі: *А дзеля цябе ніхто гаршкоў асобных ставіць не будзе, не захоча дроў дарма паліць. Многа ты іх навазіў?* (90)

Яшчэ адзін актывіст з мясцовых у аповесці "Ні госць ні гаспадар" - Арсей Анцішэўшчык, які запісаўся ў камсамол пасля доўгіх адмоў тады, калі зацікавілі яго *Бладзікавы апавяданні пра мноства выгад ад камсамолу* (172): *Жыздрыцкія камсамольцы высока сябе несці пачалі.*

---

[24] Л. Калюга, *Творы: Раман, аповесці, лісты*, Мінск 1992, с. 59. Далей пры спасылцы на гэта выданне ў дужках падаецца старонка.

Электронный архив Библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Яны ні абы-што – актыў ячэйкі.* (...). *Бладзіка прадстаўніком у сельсавет Корабач параіў выбраць* (...) *Арсей гэтаксама "чына" зарабіў: эканамічна-прававы працаўнік ён цяпер* (182).

Арсей, які ўзбіўся на *эканамічна-прававога працаўніка*, таксама, як і Бладзік, не мае пашаны да падмурка сялянскага дабрабыту (працы на гаспадарцы), пра што сведчыць заўвага яго бацькі: *Гаспадары! Ці было за мною так? Дровы мокнуць. Салому вецер разносіць па двару* (176). Паказальнымі з'яўляюцца зняважлівыя адносіны да бацькі і гэтага актывіста: *натура ў хлапца паганая* (...) *ніхто не возьме над ім вяршэнства ні сілаю, ні ласачкаю* (176), а састарэлы бацька імкнецца падвучыць, павярнуць да паважлівых адносін да гаспадаркі.

Л. Калюга ў аповесці "Ні госць ні гаспадар" стварае вобраз з сіндромам Паўліка Марозава. Змітра Алевіч – першы сакратар камсамольскай ячэйкі ў Жыздрыцы – выкрывае бацьку-самагоншчыка, які заквасіў бражку зусім выпадкова, з гаспадарскіх меркаванняў: каб не сапсавалася саладушная мука, што *заваляласяй* ў гаспадарцы. Прычым адбываецца такое выкрыццё не толькі з выкананнем "следчай" працэдуры (сын *узяў з сельсавета старшыню й двух панятых* (128)), а і з публічнай дэманстрацыяй грамадзянскай дбайнасці і шчырасці сакратара камсамольскай ячэйкі: – *Бяры, татка, панясём.* (...) *Так і пайшла ўся працэсія цераз вуліцу ў савет. Збоку глядзець – любата! Бацька з сынам наперадзе цэбар* [з бражкай. – *А.М.*] *нясуць. Куртаты Змітрук ды шчэ прыгінаецца; сын і высшы крыху, але роўна йдзе, барада аж залішне паднята. Панятыя ўслед за імі йсці паспяваюць. Людзі на двары павыходзілі – сціішна пасмейваюцца* (128).

У сувязі з характарыстыкай гэтага літаратурнага героя варта звярнуць увагу на такі паказальны факт: у пераважнай большасці выпадкаў у творы ён называецца не іначай, як *сакратар* (127, 148, 149 і інш.). Гэта чалавек без імені, чалавек пасады – выпадковы механізм свайго часу. Калі ж яго пазбаўляюць сакратарства, то да яго вяртаецца людская прыкмета: імя і прозвішча: *Далейшаму сакратару цяпер хэнць да камсамолу адпала.* (...) *Раней быў «сакратар», а цяпер – проста Змітра Алевіч. Праз яго даўнейшае сакратарства, хлапцы былі траха яго імя й прозвішча не забыліся* (154).

Л. Калюга ў аповесці "Ні госць ні гаспадар", як і А. Мрый у "Запісках Самсона Самасуя" стварае тып кіраўніка-чужынца мясцовага маштабу. Яська Корабач – гэта наброда, як называлі такіх людзей у народзе. Гэты *дутаваты з вуграмі на мардатых шчоках хлапец* (134) імкнецца заняць першынство сярод жыздрыцкай і хатніцкай моладзі. У той жа час аўтар пры дапамозе апасродкаваных рэтрас-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пекцыйных характарыстык гэтага літаратурнага героя падводзіць да наступнага ўскоснага сцвярджэння: Корабач не мае ніякага маральнага права на ідэалагічнае лідэрства. У дадзеным выпадку ў кантэксце грамадскай дзейнасці ахарактарызаваных лідэраў мясцовага значэння паўстае праблема, уласцівая не толькі гэтаму твору, а і творам іншых пісьменнікаў (А. Мрый, С. Баранавых), – праблема грамадзянскай амаральнасці кіраўнікоў мясцовага маштабу. Тут варта параўнаць рэтраспекцыйныя і рэальныя факты з кар'ернай біяграфіі Яські Корабача і Самсона Самасуя.

Вёска *ўправілася аддаліцца* (136) ад Яські Корабача, бо шэсць год ён вучыўся ў горадзе. На летніх канікулах замест таго, каб дапамагчы бацькам па гаспадарцы, ён днямі *спіць у пасцелі да паўдня*" (136), чытае кніжкі, купаецца на рэчцы ў кампаніі чарады малых, бо *большым хлопцам, яго аднагодкам, няма калі будным днём купацца йсці* (136). Яго адносіны да працы на сямейнай гаспадарцы такія: *Айчымава зямля – рабі айчым* (136). У той жа час айчым мае самыя спагадлівыя адносіны да пасынка: харчы ў Мінск яму возіць, кватэру наймае, кніжкі набывае, імкнецца справіць для Яські новую вопратку. Яська ж адмаўляецца ад такой прапановы не толькі таму, нібто *агідны былі строі, спраўленыя за айчымаў кошт* (137), а найперш таму, што яны б перашкодзілі здзяйсненню стратэгічных кар'ерных планаў Корабача, які *ўмеў змалку цвёрда на сваём стаяць, дабівацца сабе выгады. "Бяда прыперла – наўчыўся пішчаць, прасіцца*" (137). Добрая вопратка, спраўленая айчымам, сведчыла б пра тое, што Корабач *багата жыве: Няма горшага пудзіла за гэтыя словы ў наш час. Вялікая ганьба – багацце. Тым болей таму, хто дома сядзець не думае, хоча чалавекам быць, як кажуць.*

*Паглядзелі ў Цэка на яго зрыжэлую жакетку, на штаны з фрэнзлямі ўнізе. Шкада хлопца стала. Узялі дый выпатрабавалі дарэмны білет на дарогу* (137), папярэдне прызначыўшы Корабача сакратаром Хатніцкай ячэйкі па прапанове райкама.

Так пачыналася Яськава дарога ў Віцебскі ветэрынарны інстытут, дзеля паступлення ў які трэба было набыць *камандзіроўку*, казыраючы вопытам *грамадскай працы*, якую можна будзе *ў анкету ўпісаць*. Такім чынам у Хатніцы з'яўляецца новы ідэалагічны кіраўнік мясцовага значэння, але ўжо з прышлых (чужых). Вельмі трапнай аказалася характарыстыка Мотузам-бацькам не толькі гэтага актывіста, а і астатніх вясковых камсамольскіх лідэраў: *Гультай каторы ўдасца, дык і камсамолец (...) У сваёй хаце нават маю гада аднаго: жыць не дае* (143, 144).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Яська Корабач, для якога *сялянскія інтарэсы былі даўно чужыя* (147), пры гэтым праяўляе выключную двурушнасць у адносінах да гэтых *сялянскіх інтарэсаў*: *прабірае* на пасяджэнні бюро мясцовай камсамольскай ячэйкі сакратара за *арышт бацькі з самагонкаю*, даводзіць, што неабходна шанаваць бацькоў, што *нельга (...) не рабіць работы толькі затым, што ты камсамолец* (150). Ён, як і Бладзік Мотуз, арыентуецца на прынцып *трэба выкінуць* няўгодных. Пры гэтым Яська *не хоча па зубах зарабіць* (193): *Боем браць свайго вяршэнства не думае. Лепш ён гэта зробіць дакладам, пратаколамі* (193).

Такім чынам, Л. Калюга эскізна акрэслівае, як знізу (не зверху, не па палітычнай раскладцы) грамадства пакупова набліжаецца пры дапамозе сваіх кіраўнікоў мясцовага маштабу да адкрытых сацыяльных даносаў, абвінавачванняў дзеля расправы з няўгоднымі.

Своеасаблівым сабратам (таварышам па грамадскай дзейнасці Яські Корабача з аповесці Л. Калюгі "Ні госць ні гаспадар" з'яўляецца Самсон Самасуй з сатырычнага рамана Андрэя Мрыя "Запіскі Самсона Самасуя". Гэтыя літаратурныя героі – ідэалагічныя кіраўнікі мясцовага маштабу, сацыяльныя прыстасаванцы, грамадскія двурушнікі і прайдзісветы з сіндромам выкрыцця ворагаў, найперш тых, хто замінае іх дзейнасці. У той жа час такія і да іх падобныя грамадскія тыпы самі з'яўляюцца ворагамі цвярозага і мэтазгодна ўладкаванага жыцця.

У пачатку 1920-х гадоў Самсон Самасуй пасля таго, як яго кар'ера прадагента *была сапсавана* недарэчным арыштам з-за няўдалага жарту ў анкетах аб сацыяльна-эканамічным статусе сям'і, знаходзіць сабе месца, якое *адпавядала* [яго. – *А.М.*] *здольнасцям*: *у райвыканкоме ў сваіх руках трымае важныя спружыны культуры*. З'яўляючыся загадчыкам культаддзела, Самасуй мае багата іншых пасад і абавязкаў, якімі надта ганарыцца і якія дазваляюць яму адчуваць сваю значнасць, патрэбнасць і – самае галоўнае – упэўненасць у важнасці яго асобы:

> Я – сябра РВК, старшыня дзіцячай камісіі, старшыня т-ва «Прэч несвядомасць», т-ва «Няхай гадуюцца дзеткі». Я – сябра праўлення т-ва прыхільнікаў «здахаты на буржуазею». Я – раённы інспектар працы і павінен бараніць служачых ад эксплуатататарскіх замахаў загадчыкаў устаноў.
>
> Я – сябра жаночай камісі РВК (...) Я – райліт і райахова здароўя, райМОПР, райхім. А самае дзіўнае для мяне гэта тое, што я сябра раённай абортнай камісіі[25].

[25] А. Мрый, *Творы: Раман. Апавяданні, нататкі*, Мінск 1993, с. 59. Далей пры спасылцы на гэта выданне ў дужках падаецца старонка.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Дзейнасць Самасуя ў параўнанні з вясковай актывісцкай працай Корабача больш маштабная, шырокая і ўплывовая. Гэтае "больш" у спалучэнні з іншымі спрыяльнымі абставінамі (падтрымка Самасуя спачатку кіраўнікамі раённага выканаўчага камітэта, а потым акружным начальствам, урэшце – маўклівая, за рэдкім выключэннем, рэакцыя мясцовага насельніцтва на выкрутасы Самасуя і яго паплечнікаў) дазваляе разгортвацца і квітнець сацыяльнаму абсурду. У сувязі з гэтым прыгадаем некаторыя факты твора.

Бадай самым яркім прыкладам бязглуздай дзейнасці Самасуя і Мамона была так званая *сонечная кампанія* (87–90), мэта якой – *даць фізкультуру масам* і здзейсніць такім чынам *фізкультурнае выхаванне, аздараўленне шапялёўскіх мае* праз арганізацыю саляр ыя на сялянскіх сенажацях каля Сіняй рэчкі. Абсурднымі выглядаюць не столькі лозунгі гэтай кампаніі (*Мы павінны спачатку быць здаровымі, а пасля будзем мець права быць разумнымі* (87), *Без пралетарскай культуры цела не можа быць сацыялізму* (90)), колькі яе вынікі: замест таго, каб у самыя гарачыя для сялянскай гаспадаркі дні працаваць, моладзь днямі валялася на сенажацях каля рэчкі, бязлітасна іх зніпчаючы. На сялянскім мітынгу-пратэсце Ахрэм Руды вельмі трапна характарызуе такое фізічнае аздараўленне мас: *сусветнае глупства*. Паказальнымі і прадказальнымі з'яўляюцца наступныя факты. Замест таго, каб пакаяцца перад сялянамі за стаптаныя сенажаці, дапамагчы ім у іх працы, кіраўнікі *фізкультурнага выхавання* наладжваюць у Шапялёўцы (зноў жа – у самы гарачы час) *алімпіяду ва ўсіх галінах алімпійскіх гульняў* (91). Сяляне падалі на ШАЧ (*Шапялёўская асацыяцыя чырванаскурых*) у суд. Але Самасуя гэта не пужае (*Дудкі я ім заплачу!* (91), бо за яго спінай моладзь – тыя, каго ён атлуміў і разбэсціў.

Іншыя факты з дзейнасці Самасуя і яго паплечнікаў: арганізацыя *аблавы на сабак* (72–75), разнастайныя нарады, сходы і рэзалюцыі па іх (напрыклад, *Прызнаць, што кітайскі народ давяршыць пачатую справу* (102), выхаванне мас праз лозунгі (напрыклад, *Не будзем хварэць! Даём слова павялічыць жорсткую працоўную дысцыпліну на 14 проц.* (103); *Абвясцім бязлітасную барацьбу з мяккім целам. Няхай жыве сталёвасць ва ўсім* (104)), выкрыццё *ідэалагічных хістанняў* Торбы (113–117) і інш.

Сярод названых вышэй і іншых фактаў дзейнасці Самасуя і яго кампаніі самымі небяспечнымі і прадказальнымі ў сацыяльным плане былі такія, як перайменаванне вуліц і пад гэтую марку ўзвялічванне імёнаў мясцовых кіраўнікоў (прапанова Самасуя перайменаваць Баль-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

нічную вуліцу ў Шапялёўцы і самую яе адпаведна ў вуліцу т. Сома (Сом – старшыня РВК) і Сомск), замаўленне бюстаў (помнікаў жывым) старшыні РВК і сакратара райкама (107), цэнзура ў насценнай газеце, арганізаваная Самасуем (113), ідэалагічны *таварыскі суд* над Торбам (113–117), падставай для якога была дырэктыва з райкама, бо *дырэктыва вышэй за ўсё* (113).

Паказальным і прадказальным з'яўляецца і той факт, што ў фінале твора Самасуя пераводзяць (пасля спробы пакарання за *нетактоўныя паводзіны*) *у акругу на больш адказную працу* – самасуеўшчына ўмацоўваецца.

Сацыяльны абсурд, арганізаваны самасуямі, мамонамі, сомамі і інш. (і не толькі ў Шапялёўцы, калі выйдзем за межы рамана "Запіскі Самсона Самасуя"), перакрэслівае самую магчымасць наладжвання здаровых сацыяльных адносін.

Самсон Самасуй, Яська Корабач – начлежнікі, якія (прыгадаем Купалаў верш "Вечарынка") *закаціліся з разбегу* ў сялянскую хату і імкнуцца паставіць усіх у *шарэнгу*. Гэтыя чужынцы не маюць маральнага права здзяйсняць сацыяльныя пераўтварэнні, бо яны (такія кіраўнікі) – асобы разбуральнага кшталту, не прымаюць, адвяргаюць той грунт, на якім павінны здзяйсняцца гэтыя змены. Прыгадаем у сувязі з гэтым прыведзеныя вышэй факты адносін Корабача да працы на айчымавай гаспадарцы, а таксама пагардлівае стаўленне Самасуя да сялянскай працы на зямлі: *Буду калупацца ў пясочку вашым?* (...) *Бачыўшы цывілізацыю, які разумны чалавек пачне рабіць гэта калупайства ваша? Які сэнс у вашай* [бацькавай і маткі. – *А.М.*] *крацінай працы?* (31)

Самасуй свядома выракаецца працы на бацькавай зямлі, гэтым самым выказваючы пагарду да таго, што з'яўляецца падмуркам сялянскага жыцця. У той жа час ён бярэ на сябе абавязкі кіраваць вясковым побытам.

Жанравая форма рамана "Запіскі Самсона Самасуя" – апавядальная гісторыя ў запісках – спрыяе самавыкрыццю галоўнага героя твора. Працэс самавыкрыцця ўзмацняецца яшчэ і тым, што Самасуй упэўнены ў закрытасці яго запісак: яны для ўласнага карыстання. Гэта дазволіла аўтару максімальна распрануць Самасуевы намеры і памкненні, выявіць іх абсурдную сутнасць пры дапамозе відавочнага, выразна падкрэсленага гратэску, што ў сваю чаргу стварыла эфект сацыяльнага выбуху сатырычнага зместу гэтага твора.

Яшчэ адзін тып вясковага кіраўніка прадстаўлены ў аповесці Сымона Баранавых "Межы": вобраз Аніся-агітатара – актывіста мясцова-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

га руху за калектыўную гаспадарку: Убачыўшы *"чырвань" рэвалюцыі*, Аніcь-вайсковец *"кінуўся напралом" у яе.*

*Нутром нешта адчуў у гэтым сымбалі. Роднае нешта, сваё ўбачыў. Адчуў братнюю кроў... усё прасмоктанае кроўю. Родную кроўю такіх, як сам. (...) Адразу ўзлюбіў чырвоныя штандары. (...) Ты толькі прыслухайся і ўспомні... Успомні, і ўбачыш... кожны крок прошлага ў крывавай расе*[26].

Вярнуўся з войска Аніcь на запусцелую гаспадарку. Аднаўляць яе ўзяўся *з новым уздымам, з новым запалам* (138). Калі распачаўся рух за калектыўную гаспадарку, прыгадаў словы палітрука пра тое, што *супраць гарту нішто на свеце не ўстаіць* (138); пачаў агітаваць бродаўцаў за калектыў, хоць тыя не разумелі яго з ідэяй гурта, *на смех паднялі* (139). Аднак Аніcь, *трапяткі і ліпкі*, дамагаўся свайго: *Калі прыстане, прычэпіцца да чаго – не адкараскаешся, пакуль не паставіць на сваім* (188). Пакідаючы па-за ўвагай працэс і сутнасць Анісевай агітацыі за калектыў, рэагаванне на такую агітацыю сялян (132, 135, 167–169), звернемся да паказальнага факта, які характарызуе Аніся як вясковага пана новага тыпу. Яўген Бурцелік частку сваёй гаспадаркі далучае да заняпалай Анісевай, паддаўшыся ўгаворам апошняга. Пры гэтым заўважым наступнае. Яўген нібыта вясковы актывіст. Аднак жа ён быў абраны *членам сельсавета* толькі таму, што сяляне такім чынам жадалі *дапякчы* заможным Бурцелікавым: хай і яны акунуцца ў грамадскую каламуць. Яўген далучае сваю частку гаспадаркі да Анісевай не таму, што ён перакананы ў карыснасці калектыўнага гаспадарання, а таму, што жадаў *дапячы* не толькі бацьку, што круціўся з яго жонкай, а і Карпусю, Ярэму, Аўласу (150), якія былі супраць калектыву: (...) *Мы першымі будзем. І не толькі па спіску, – казаў Аніcь, – а і на справе. Так што няхай далучаюцца, хто хоча* (149).

Тут бы Анісю напружыцца, аддаць усе сілы новай – узбуйненай, калектыўнай (у такім яе выглядзе) – гаспадарцы. Аднак замест гэтага ён з яшчэ большым імпэтам аддаецца грамадскай працы. А на "калектыўнай" гаспадарцы ў гэты час працуе Яўген. "Дабраахвотнік", гэты *спакойны гаспадарскі хлопец* (107) з часткай моцнай бацькавай гаспадаркі аказваецца парабкам у гультая. Паказальнай паводле сутнасці такога тыпу кіравання і кіраўніка з'яўляецца характарыстыка Аніся, агучаная Юстынай: абібок узбіваецца на *каралеўства:*

[26] С. Баранавых, *Новая дарога: Апавяданні, аповесці, раман, лісты*, Мінск 1989, с. 138. Далей пры спасылцы на гэта выданне ў дужках падаецца старонка.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

– Учора араў [Яўген. – *А.М.*]. Аж да самага цямночку. А сам [Анісь. – *А.М.*] – нябось не пайшоў на поле. Цэлы дзень то на прыгуменні, то каля заплоцця абціраўся. (...)

– А днём ужо, калі на прыгуменні (...) ляжаў, дык яна, гэтая самая Наталлечка [Анісева жонка. – *А.М.*], выйнула на ганак ды: "Анісь. Анісь. ідзі палуднаваць!" Той [Яўген. – *А.М.*] нябось на полі без полудня, а яны ўдваіх – гарачая, сабе, страва (...). Дык вось, ты, мая любая, яны якія мяргуюцца аляктывы. (...)

– Прыклеіў [Анісь. – *А.М.*] на нпуле нейкую паперу. Ведайце, што ён ужо нейкі рыцар! (...) ні цэ ні бэ, а на каралеўства прэ! (170–171)

Такім чынам пачалі спраўджвацца Карпусевы прадказанні адносна працы і камандзірства ў калектыве: *якраз палавіна будзе камандзіраў* (135), бо багата такіх, што не хочуць працаваць.

Анісь у час агітацыі за перадзел межаў *хоць сёння рад гуртавой рабоце* (135), *бо ўсё гэта вельмі добра цяміць*. Такую цямнасць ён набыў і набывае ад чужых: *у службе* – ад палітрука, у вёсцы – ад прыезджых агітатараў. У сувязі з апошнім звернем увагу на ролю мастацкіх дэталяў у аповесці "Межы": яны спрыяюць выяўленню сутнасці прамоў агітатараў: тое, за што яны агітуюць, чужое для сялян, як чужыя і самі гэтыя прамоўцы.

Агітатары за калектыў у аповесці "Межы" не маюць імёнаў: "*прыезджы для выбірання*" "*ў члены сельсавета*" (109); чалавек – "*мусіць. аж з акругі*" "*з залатым зубам*" і "*зачэсанымі назад*" (131) валасамі, які агітаваў супраць межаў; *незнаёмы ў сівой накідцы чалавек (Анісь зваў яго шэфам)*, *чалавек у абручастых вялікіх акулярах* (200) – яны прыехалі на перадзел, на *выразку зямлі тым, хто не ідзе ў калектыў* (200). Спачатку камісар на *службе*, а потым гэтыя *шэфы* ўмацоўваюць Анісеву веру ў жыццёвую трываласць *калектыву*. Чужое тут выходзіць на паверхню і імкнецца перамагчы. Прыгадаем: залаты зуб спераду, зачасаныя назад валасы, акуляры – гэта прыкметы нечага чужога для сялянства. Акрамя гэтага, залаты зуб спераду сведчыць пра імкненне чалавека вылучыцца, выдзеліць сябе сярод астатніх; часам такі атрыбут паказвае на тое, што чалавек, выйшаўшы з бруду. імкнецца папасці ў князі. Залаты зуб, зачасаныя назад валасы і іншыя дэталі ў дадзеным выпадку падкрэсліваюць, што гэтыя чужынцы прылічылі сябе да людзей з больш высокім, чым у сялян, статусам і перакананы ў тым, што праўда на іх баку. А калі статус іншы, не сялянскі. то паўстае наступнае пытанне. Паводле якога права яны павучаюць і агітуюць сялян, схіляюць іх да *калектыву*? Адзіны магчымы адказ – рэвалюцыйнага. Чужое для сялян рэвалюцыйнае права дазваляе гуль-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

таю Анісю адчуваць сябе ўпэўнена ў сітуацыі грамадскай няпэўнасці, нявызначанасці навязваць гэтае чужое астатнім – тым, хто альбо не згодны прымаць гэтае чужое, альбо хістаецца ў адносінах да яго: *Цераз газету першы раз даведаўся* [Яўген. – *А.М.*] *аб калектыве, аб камуне, аб гэтым гуртавым жыцці. А тут Анісь сфармаваў, прывёў да парадку тое, аб чым даведаўся Яўген праз газету і чаго не мог угрунтавацца сваім розумам* (116).

Такім чынам, названыя вышэй мастацкія дэталі ў падзейным кантэксце аповесці выконваюць функцыю сэнсаўтваральнай карэкцыі: удакладняюць сутнасць таго, за што агітуюць і так хваляць гэтыя прыезджыя: аб'ектыўна яно чужое для сялян. Такім чынам кантэкстуальна апраўдваецца права сялян, якія супраць калектыву, на іх нязгоду, на пратэст супраць перадзелу зямлі, супраць аб'яднання ў адной гаспадарцы працаўнікоў і лайдакоў.

Пракоп: стаяў каля стала, глядзеў на гурт выпушчаных Параскаю з падпечка курэй і казаў:

– Бачыш, як спяшаюцца. Кожная сама па сабе. Так і ў калектыве ў тваім – адзін цераз другога будзе хапаць, каб пад'есці (116).

Пракоп: Ну, я маю... маю, скажам, і хлеб і да хлеба... (...) Ды і ты.. і ты каторы май. Май, гэна, хоць цэлыя маёнткі! Я і слова не скажу (...). І павагу аддам: бо тваё ж гэта, тваё, нажытое тое! Дык што мне ты ці другому, каторы, зайздросціш? Не гультуй, а нажыві... (...)

Карпусь: Я, пане мой, плойму грошай высыпаў на жней, на касцоў, на трасцу розную, за год. Дык гэтага ніхто не бачыць і не бярэ на ўніманне. У савеце толькі бачаць, што ты маеш. У цябе ёсць. Дык нажыві, трасца тваёй савецкай матары, нажыві сваё ды і камандуй ім, а не то што... (176).

У сувязі з праблемай "агітатар-чужынец" варта адзначыць, што ў аповесці "Новая дарога" С. Баранавых прадстаўлены літаратурны вобраз прыезджага кіраўніка, якому не чужыя сялянскія інтарэсы. Гэта вобраз Вацікa Такарскага – рабочага з горада, які прысланы ў Мураейнікі на дапамогу ў арганізацыі калгасу. Вацік, хоць і нясмела, выступае за памяркоўнасць, разважлівасць, чалавечнасць у адносінах да раскулачвання (289–294). Ён спачувае раскулачанай сям'і Міхася Кляўко. Своеасаблівым Вацікавым пратэстам была адмова падпісаць акт аб раскулачванні Міхася Кляўко, бо разумеў, што адбываецца несправядлівасць у адносінах да працавітага селяніна. Такі пратэст перададзены аўтарам аповесці прадстаўніку "свядомай часткі грамадства", прызванага кіраваць калектывізацыяй. Гэта дазволіла С. Баранавых як аўтару аповесці, з аднаго боку, дыстанцыравацца

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ад крытычнага стаўлення да калектывізацыі, а з другога, сцвердзіць разумны, памяркоўны і чалавечы падыход да гэтага працэсу (аспрэчыць яго поўнасцю аўтар не мог па розных прычынах: аб'ектыўных і суб'ектыўных).

Вацік Такарскі, хоць і стаіць у апазіцыі да напорыстасці і нялюдскасці старшыні сельсавета Харытона Мамчыца, усё ж не можа рашыцца на адкрыты і рашучы адпор гэтаму сельсаветчыку і яго класавай "пільнасці". У С. Баранавых былі, відаць, сумненні адносна магчымасці пераўладкавання сялянскага паслярэвалюцыйнага жыцця пры дапамозе мудрых парад таварышаў з раёна, горада і да т.п. Нездарма ж, думаецца, *аднаасобныя таварышы* сяляне ў "Новай дарозе" імкнуцца дабіцца праўды самастойна пры дапамозе выкрывальнага ліста Калініну. І толькі ў фінале аповесці ва ўласных разважаннях–прызнаннях, вяртаючыся ў Муравейнікі з горада, Вацік дакарае сябе за нясмеласць у адносінах да раскулачвання Міхася Кляўко, мяркуе пакаяцца перад сялянскім сходам, сказаць, што *зрабіў сваёю глухатою і слепатою пакасць* (363). Аднак такое пакаянне не адбываецца; заканчваецца аповесць, а Вацікаў намер застаецца нязздейсненым.

У аповесці "Новая дарога" С. Баранавых выводзіць на першы план барацьбы за сацыяльную справядлівасць у Муравейніках старшыню мясцовага сельсавета, выбранага ў другі раз, – Харытона Мамчыца. Сацыяльная воля, за якую ён змагаўся на фронце, на сялянскіх сходах зараз аказалася ў яго руках як воля для старшыні сельсавета. *Дык чаму ж і не пець, калі воля ў сваіх руках* (300), – разважае гэты "герой" мясцовага значэння. Мамчыц паступова, але рашуча ўзыходзіць на дарогу, якая павінна прывесці яго да адчування паўнаты ўлады над чалавекам. *У мяне рука не здрыганецца* (301) – гэта сказана Мамчыцам не толькі ў адрас заможных сялян у сувязі з іх раскулачваннем, гэта агучана і для астатніх: хай баяцца, бо ён улада, ён суддзя, ён выканаўца прысуду, які выносіць. *Хай бачаць і калгаснікі нашы, як мы з ворагам змагаемся...* (301). У гэтым *хай бачаць* ёсць пагроза: няхай ведаюць, дзе сіла і баяцца яе, бо яна можа быць скіравана супраць іх.

Жорсткасць, крыважэрнасць, нялюдскасць Мамчыца як чалавека і кіраўніка напоўніцу выявіліся ў час раскулачвання Міхася Кляўко (303–310) – сапраўднага бандыцкага налёту на сям'ю селяніна-працаўніка. Толькі напад гэты матываваўся барацьбой за сацыяльную справядлівасць

Асноўная прычына, на грунце якой разгараецца непаразуменне паміж Вацікам і старшынёй сельсавета Харытонам Мамчыцам, – Міхля, за сэрца якой змагаўся Мамчыц. Гэтае змаганне прыводзіць да та-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

го, што старшыня сельсавета імкнуўся не столькі дасягнуць сацыяльнай справядлівасці ў час раскулачвання, колькі, адсунуўшы на другі план гэтага змагання Ваціка, паказаць уласнае геройства, сваю ўладу і гэтым самым растапіць халоднае сэрца Міхаліны. Асабістыя амбіцыі кіраўніка мясцовай улады нараджаюць чалавечыя трагедыі. Асабліва ярка пра гэта сведчыць эпізод раскулачвання Міхася Кляўко, якім апантана кіраваў Мамчыц.

Такім чынам яшчэ адзін літаратурны герой з галерэі змагароў за "светлае будучае" перакрэслівае саму магчымасць дасягнення такога будучага. На першы план выходзіць светлае для сябе, воля для сябе, бо *воля ў сваіх руках.*

На падставе прыведзеных вышэй назіранняў, характарыстык і высноў можна зрабіць наступныя падагульненні.

У разгледжаных літаратурных творах М. Гарэцкага, М. Зарэцкага, Л. Калюгі, С. Баранавых, А. Мрыя прапанавана не толькі мастацкая канстатацыя і характарыстыка разбуральных праяў паслярэвалюцыйнай рэчаіснасці і яе "герояў", а і своеасаблівае сацыяльнае выкрыццё і папярэджанне. Сутнасць такога выкрыцця і сацыяльнага папярэджання: а) дастаткова трапная характарыстыка актывістаў і кіраўнікоў новага жыцця як асоб разбуральнага кшталту, якія змагаюцца за "лепшае" будучае найперш дзеля самасцвярджэння і дасягнення пры гэтым уласнай выгады, сацыяльнага ўзвышэння і перавагі над тымі, чыё жыццё яны імкнуцца перайначыць; б) адлюстраванне герояў з дэструкцыйнымі схільнасцямі і памкненнямі, а таксама працэсу навязвання і дамінавання рэвалюцыйнай ідэалогіі, працэсу яе вульгарызацыі на падставе дзейнасці усё тых жа "герояў" паслярэвалюцыйнай рэчаіснасці; в) апасродкаванае прадказанне таго, што дасягненні новых герояў, іх "апантанасць" грамадскай працай, трываласць актывісцкага становішча, перспектывы вынікаў такой дзейнасці, а таксама безабароннасць, маўклівасць, несупраціўленне тых, дзеля каго ўсё гэта здзяйсняецца, – гэта падмурак для пашырэння і ўмацавання сацыяльнага двурушніцтва і грамадскай несправядлівасці.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

STRESZCZENIE

SPOŁECZNE PRZEPOWIADANIE CZY STWIERDZANIE FAKTÓW?
(PROZA BIAŁORUSKA W LATACH 20-TYCH I 30-TYCH XX WIEKU

Na podstawie obserwacji faktów opisanych w wybranych utworach omówiono wydarzenia społeczne. Dążenia przywódców okresu post-rewolucyjnego w procesie przeniesienia ich do świata utworów mają wpływ na utworzenie takiego kontekstu, który w pewnych sytuacjach niesie ze sobą patos oceniający ("Dwie dusze" M. Gareckiego, "Zapiski Samsona Samosuja" A. Mryja, "Ni hość, ni haspadar" L. Kalugi), a w innych podwójne znaczenie: uwidacznia się w pochwałach lub osądach, a także w zaakceptowaniu lub odrzuceniu faktów, zjawisk, bohaterów i antybohaterów rzeczywistości prototypowej („Wileńscy Komunardzi" M. Gareckiego, „Ścieżki – darożki" M. Zareckogo, „Mieży", „Nowaja daroga" S. Baranawych).


**Słowa kluczowe**: literatura bialoruska, okres post-rewolucyjny, rozbieżna rzeczywistość, socjalny status autora, patos, dwuznaczność, pochwały, osądy, bohater, antybohater.


SUMMARY

SOCIAL PREDICTIONS OR STATEMENT OF FACTS?
(BELARUSIAN PROSE IN THE 1920S AND 1930S)

On the basis of the observations concerning literary factuality the article characterizes the ways post-revolutionary events and public leaders' aspirations are transformed into artistic world of the literary work to create context which has either disapproving pathos ("Two Souls" by M. Goretsky, "Notes by Samson Samosui" by A. Mriy, "Neither Guest nor Host" by L. Kalyuga) or the equivocality: praise and disapproval, admission and rejection of facts, notions, heroes and anti-heroes of the prototypic reality ("Vilenskiye Kommunards" by M. Goretsky, "Pathways" by M. Zaretsky, "Boundaries", "New Way" by S. Baranovyh).


**Key words**: Belarusian literature, post-revolutionary period, contradictory reality, writer's social status, pathos, equivocality, praises, disapproval, hero, anti-hero.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова